
Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ



НАША СЛОВА



Газета выходзіць з сакавіка 1990 года № 32(469) 16 ЖНІЎНЯ 2000 г.

"7" ліпеня 2000 г. № 498

Спадару Уладзіміру Ярмошыну,
Прэм'ер-міністру Рэспублікі Беларусь,
Дом Ураду, пл. Незалежнасці 220010 Менск.

Спадару Міхаілу Мясніковічу,
Кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь,
38, К.Маркса вул. 220016 Менск.

Ад імя ініцыятыўнай групы па стварэнні Беларускага Нацыянальнага Універсітэта (БНУ) просім Вас знайсці магчымасць сустрэцца з кіраўніцтвам нашых арганізацый ў ліпені гэтага года для абмеркавання пытання крытычнага стану беларускамоўнага навучання ў нашай краіне і шляхоў стварэння першай у Беларусі ВНУ з беларускай мовай навучання.

Мы лічым, што Беларусь як **монацыянальная** краіна, дзе карэнная нацыя складае выключную бальшыню ад усяго жыхарства – 81,7%; а 85,6% беларусаў лічаць беларускую мову сваёй роднай (паводле вынікаў апошняга перапісу насельніцтва), мае права мець сваю нацыянальную (менавіта баларускамоўную!) сістэму адукацыі. Як Вам павінна быць вядома, на сёння наша краіна не мае аніводнай ВНУ, дзе ўсе дысцыпліны выкладаліся б выключна па-беларуску. Патрабуе тэрміновага вырашэння і агульны стан узнятай праблемы.

На сёння намі сабрана каля 30 тысячаў подпісаў грамадзянаў з патрабаваннем адкрыцця БНУ. Канцэпцыя першай сапраўды беларускамоўнай вышэйшаў навучальнай установы распрацаваная лепшымі беларускімі навукоўцамі і надрукаваная ў СМІ дзеля найшырэйшага абмеркавання, у якім бяруць удзел і афіцыйныя асобы. Распрацаваны таксама і праект Статута БНУ, а выкладаць у ім ужо выказалі жаданне сёньняшнія супрацоўнікі Нацыянальнай Акадэміі Навук, БДУ, БДПУ імя М.Танка, БДПА і іншых ВНУ, а таксама вядомыя навукоўцы з замежжа (акадэмікі, дактары і кандыдаты навук, прафесары і дацэнты).

Адкрыццё ў Беларусі прэстыжнай ВНУ з улікам досведу лепшых універсітэтаў Еўропы на пачатку новага тысячагоддзя стане актам добрай волі, дзейсным забеспячэннем правоў грамадзянаў, гарантаваных Канстытуцыяй нашай краіны, а таксама станецца добрым чыннікам узаемаразумення ў грамадстве.

З павагай

Старшыня ТБМ *Алег Трусаў,*
Прэзідэнт Згуртавання беларусаў свету *Радзім Гарэцкі,*
Прэзідэнт Таварыства беларускай школы *Алесь Лозка.*

Універсітэту ў Лідзе быць?

ПРЭС – РЭЛІЗ ТБМ

Другога жніўня адбылася сустрэча кіраўніцтва ТБМ імя Ф.Скарыны з рэктарам Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта сп. Леанідам Ціханавым па абмеркаванні пытанняў, звязаных з адкрыццём Беларускага Нацыянальнага Універсітэта.

Старшыня ТБМ Алег Трусаў распавёў пра акалічнасці стварэння БНУ і перадаў матэрыялы, распрацаваныя Таварыствам.

Сп. Ціханаў паведаміў, што ў Педагагічным універсітэце беларускамоўныя плыні былі ўтвораныя значна раней, а цяпер практычна цалкам установа перайшла на беларускамоўнае выкладанне. Гэты пераход закрануў найбольш кафедры натуразнаўчых і дакладных дысцыплін. Ва універсітэце распрацаваная падтрымка выкладчыкам, якія пераходзяць на беларускую мову выкладання. Пастаянным застаецца пакагчык выбару мовы – больш за палову абітурыентаў трымаюць уступныя іспыты па беларускай мове і літаратуры. Спадараджае надзею на тое, што конкурс на спецыяльнасці, звязаныя з роднай мовай, культурай ды гісторыяй, адзін з найбольш высокіх – 3-4 асобы на месца.

На сустрэчы вялася гутарка і пра стварэнне філіялу педуніверсітэта ў Лідзе. Рэктар пагадзіўся паставіць гэтае пытанне дзеля абмеркавання на вучонай Радзе.

Акадэмік Ціханаў выказаў пэўнае зацікаўленне ў справе стварэння БНУ і прапанаваў абраць месцам працы універсітэта старажытнае Заслаўе, узгадаўшы еўрапейскую традыцыю месціць элітныя навучальныя ўстановы ў мястэчках блізу буйных гарадоў.

Першы міжнародны пленэр імя Фердынанда Рушчыца

У межах падрыхтоўкі да 130-х угодкаў (10 снежня 2000 г.) вялікага беларускага мастака Фердынанда Рушчыца

4 жніўня на ягонай радзіме ў вёсцы Багданаў Валожынскага раёну пачаўся Першы міжнародны пленэр імя Ф. Рушчыца

Зямля, дзе стаяў фальварак Рушчыцаў, дзе мастак жыў і працаваў, дзе стварыў большасць сваіх твораў, збірае мастакоў з розных гарадоў Беларусі, Польшчы, Летувы.

Задача ўдзельнікаў пленэру – пазнаёміцца з радзімаю выдатнага мастака, прайсціся ягонымі сцежкамі. А ў выніку судакранання з крыніцаю мастацкае творчасці, зямлёю Ф.Рашчыца, народзяцца творы сучасных мастакоў – на палотнах і паперы, у камені і бронзе.

Мяркуецца стварэнне праекту адбудовы радзіннага фальварка мастака, каб на будучыню там быў дом-музей творцы. У выніку пленэру спланаваны выставы ў Гальшанах і Багданаве.

У снежанскія юбілейныя дні адчыніцца вялікая выстава ўдзельнікаў пленэру ў адной са сталічных галерэяў.

Арганізуе гэтае выдатнае культурніцкае мерапрыемства Беларускі саюз мастакоў пры падтрымцы Валожынскага і Ашмянскага райвыканкамаў.

Намеснік старшыні Аргкамітэта Мікола Купава.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Мінск, Дом Урада

В. І. Стражаву
А.У. Казуліну

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь" права стварэння ўстаноў адукацыі належыць Міністэрству адукацыі.

Прашу правесці сустрэчу з прадстаўнікамі азначаных арганізацый і абмеркаваць пастаўленыя пытанні.

Аб выніках інфармуйце Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь;

Таварыства беларускай мовы;
Таварыства беларускай школы;
Згуртаванне беларусаў свету.

М. Дзямчук.

17 ліпеня 2000 г.
№ 05/535-128

Шаноўнае спадарства

Сёння мы можам ізноў аб'явіць падпіску на "Наша слова". Ячшэ не выйшаў з друку каталог на 4-ты квартал 2000-га года, але падпіска не спынялася, таму мы прапануем вам падпісвацца менавіта зараз па старому каталогу. У большасці аддзяленняў прымаюць падпіску па старому каталогу. Разам з тым рэдакцыя мае інфармацыю, што са з'яўленнем новага каталога зноў вырасце кошт падпіскі. Даводзім да вашага ведама, што мы ні на капейку не падымалі цану на газету, а той рост, які можа з'явіцца будзе выключна ростам цаны на паслугі пошты. Практычна ўжо палову падпісных грошай будзе заставацца на пошце.

Шаноўнае спадарства! Даводзім да вашага ведама, што канфлікт паміж рэдакцыяй газеты "Наша слова" і "Белпоштай" цалкам вычарпаны. Усе грошы за падпіску на 3-ці квартал на рахунак рэдакцыі паступілі. Затрымка грошай ніякай палітычнай афарбоўкі не насіла. Мела месца тэхнічная наўвязка. Мы аднаўляем выхад нармальнай 8-мі палоснай газеты і чакаем вашай падтрымкі.

Будзьце з намі.

БЕЛАРУСКАЯ СЛУЖБА РАДЫЁ "СВАБОДА"

Новыя хвалі ад 26 сакавіка 2000 года

Час	khz	Хвалі
18.00 – 19.30	7295	41
	9610	31
	11725	25
	15565	19
22.0– 23.30	6105	49
	9535, 9750	31
	11865	25
06.00 – 07.00	6065	49
	7295	41
	9635, 9750	31

Сярэднія хвалі – 576 і 612 кГц

Наш адрас: 220005, Менск-5, п/с 111; Vinohradska 1, Praha 110 00 CZ.

Праграму можна слухаць, чытаць, а таксама пісаць у рэдакцыю праз ІНТЭРНЭТ: WWW.SVABODA.ORG

НАСТРОЙЦЕСЯ НА "СВАБОДУ"!

Ф. СП - 1

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету / часопіс **63865** (індэкс выдання)

НАША СЛОВА
(назва выдання)

На 2000 год па месяцах:

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12
									X	X	X

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТАЧКА

ПВ | месца | літар

на газету / часопіс **63865** (індэкс выдання)

НАША СЛОВА
(назва выдання)


Кошт	падпіскі / пераадрасоўкі	441 руб. / руб.	Колькасць камплектаў	1

На2000 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12
									X	X	X

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)



№ 32 (469) 16 ЖНІЎНЯ 2000 г. наша СЛОВА

“Здабывай правы, старадаўнія...”

“Як даўней была мова руская,
Старадаўняя, беларуская,
На табе з Літвой красавалася,
За найлепшую называлася.
У ей пісаліся твае граматы,
Аб чым сведчуць старыя пергаменты,
Каралі, князі з баярамі
Карысталіся ее дарамі...
А цяпер яна занядбаная,
Як найгоршая, як паганая.
Здабывай правы – старадаўнія.”

Гэтыя ўзвышаныя словы пра беларускую мову напісаў вядомы дзеяч беларускага Адраджэння – Язэп Драздовіч у паэме “Трызна мінуўшчыны” (1936 г.). Мастак па прафесіі, ён працаваў як археолаг і этнограф, выкладаў у беларускіх гімназіях маляванне і геаграфію, ствараў жывапісныя карціны па гісторыі Полацкага княства, надаваў мастацкі дух і ствараў нацыянальны каларыт у партрэтах князя Усяслава-Чарадзея і Францішка Скарыны, пісаў гістарычны раман “Гарадольская пушча”, выдаў першую на Беларусі кнігу па астраноміі “Нябесныя бегі” (1930 г.), марыў аб выданні манаграфіі “Тэорыі руху ў касмалагічным значэнні” (1949 г.), узносіў у касмічныя прасторы Месяца беларускія гарады і вежы, ствараў чарцяжы “касмічнай тарпеды”, на якой “зямныя турысты” павінны адправіцца ў падарожжа на планеты Сонечнай сыстэмы, дзе ўжо існуе разумнае жыццё.

А ці не шмат гэта працы для аднаго чалавека? Ці можа трэба было заняцца нечым адным – больш плённа, больш дакладна? Але для таго існуе таленавітасць, геніяльнасць, якая патрабуе ад чалавека ўсёй яго самааддананасці, энтузіязму, самаахвярнасці ў імя вышэйшага, у імя свайго народа, які жадаў “людзьмі звацца”.

Сёння мы кажам, што дух беларускага Адраджэння нарадзіў Я.Купалу, М.Багдановіча, В.Ластоўскага, разам з сотнямі, тысячамі палымяных сэрцаў, якія білісі і гарэлі ў вачах і творах беларусаў, якія працавалі дзеля свабоды і прыгожасці роднай зямлі, якая спявала ім свае паданні на беларускай мове, ускалыхвала іх памяць, абуджала чалавечую годнасць і нараджала новае пачуццё – пачуццё асабістай бясконцай працы дзеля будучай Беларусі. Менавіта так нараджаліся першыя беларускія газеты і часопісы, кнігі, якія аздабляліся мастакамі, нібыта падарунак для каханай, нібыта самы дзіўны сон.

Колькі незвычайных адкрыццяў захоўвае для нас гэты залаты шэдэўр беларускага Адраджэння у бібліятэках, архівах, музеях. **Якая духоўная, найпатрэбнейшая моц захавана ў гэтых творах – творах народжаных беларускай ідэяй Адраджэння незалежнасці, дзяржаўнасці і культурнай** самабытнасці людзей, якія называлі сябе “тутэйшымі”. Якая вера і надзея павінна была рухаць тых, хто трымаў сцяг нацыянальна-культурнага вертазя, імкнуўшага да берагоў “самачыннай” Беларусі?

Але сёння пытанне аб новай плыні беларускага Адраджэння вымушае не толькі добра ведаць і цікавіцца гісторыяй культурнага будаўніцтва, але патрабуе значна больш – самааддананага жыцця і ўпэўненасці, самаахвярнасці ў сваёй працы, новых пошукаў і новых здзяйсненняў для вяртання “роднаму дзіцяці” яго матчынай мовы, яе нацыянальнай і дзяржаўнай свабоды не на аркушы паперы, а ў паўсядзённым жыцці на зямлі Беларусі. Камусьці гэта падаецца недасяжнай марай, іншаму гэта наогул непатрэбна. Але гэта патрэбна нам – беларусам, дакрануўшымся да глыбіні духоўнага жыцця такіх культурных волатаў, якімі былі Аляксандр Уласаў і Вацлаў Ластоўскі, Іван і Антон Луцкевічы, Францішак Аляхновіч і Уладзімір Жылка, Язэп Драздовіч і Пётра Сергіевіч, Наталля Арсеннева і Ларыса Геніюш.

Мы павінны сёння гаварыць аб гэтых духоўных асілках Беларусі ў школах, інстытутах, у працоўных калектывах нашых гарадоў, на вёсках, там дзе гісторыя беларускага змагання за родную мову, за сваю нацыянальную культуру не асэнсавана людзьмі таму, што яны не ведаюць імёны тых, хто здабываў і ствараў прыгажосць не дзеля славы, багацця, а толькі дзеля будучага рунеючага полі беларушчыны – найпрыгажэйшага на гэтай Зямлі.

Нам не хапае сёння нават месца, каб размаўляць свабодна з людзьмі, якія жадалі бы даведацца аб невядомых старонках беларускай культуры, аб жыцці **песняроў роднага слова, якое будзіла і будзіць сёння заспаныя душы людзей.** Нам шмат чаго не хапае сёння, як і ўсім, хто жыве на Беларусі, але у нас ёсць тое, чаго не маюць яны, бо мы маем святую мэту – мэту стварэння жыцця роднай мове, за якую трэба змагацца так, як рабілі гэта дзеячы беларускага Адраджэння, заклікаючы нас “здабываць правы старадаўнія”.

Малаш Юры – старшыня ТБМ
“[illegible]” ў г. Заслаўе.

Аповесць пра словы

З біяграфіі словаў

Пра аўтара

Іван Паўлавіч Шпадарук нарадзіўся ў в. Бабічы, Рэчыцкага р-на Гомельскай вобласці ў сям'і рабочага-чыгуначніка. Закончыў Менскую вышэйшую партшколу (журналістыка), Беларускі дзяржуніверсітэт (руская мова і літаратура), аспірантуру Белдзяржуніверсітэта (гісторыя філасофіі). Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій, інструктар па здароўестваральнаму ладу жыцця Міжнароднай акадэміі герanталогіі, сябар Саюза журналістаў СССР і Беларусі. Працаваў у друку і на тэлебачанні, выкладаў журналістыку ў Менскай Вышэйшай партшколе і філасофію ў Менскім дзяржпедінстытуце замежных моваў.

Ён знакомы чытачам па 10 кнігах: “Змагары за народную справу”, “У свеце кур'ёзаў”, “Ф. М. Цастаеўскі і Беларусь”, “Займальная мазаіка”, “З біяграфіі прывычных рэчаў”, “Інстытут замежных моваў”, “Пад сцягамі Камуны”, “Руская секцыя I Інтэрнацыяналу і яе сацыялагічныя погляды”, “У свеце слоў, з'яў і фактаў”, “Чаму мы так гаворым?”. Яго матэрыялы па розных пытаннях друкаваліся ў газетах, часопісах і зборніках.

Бульба, хлеб

Існуе дзве найбольш абгрунтаваныя гіпотэзы пра паходжанне слова *бульба*. Паводле першай, яно прыйшло да нас праз пасярэдніцтва заходнеславянскіх моў з латыні, дзе ***“бульбус”*** значыць “клубень, цыбуліна”. Прыхільнікі другой гіпотэзы бачаць першакрыніцу ўсходнеславянскага ***“бульба”*** ў нямецкім ***“боле”*** – “клубень, цыбуліна” (праз заходнееўрапейскія мовы).

Большасць этымолагаў лічыць, што лексема ***хлеб*** праславянскага паходжання, **запазычаная са старанямецкага *“хлеіб”*** – фармавы хлеб. У славян гэтае запазычанае слова асэнсавалася з кіслым уфармаваным хлебам.

Жыта, пшаніца

Жыта – праславянскае па паходжанні слова. Тут той жа корань, што і ў слове ***жыць***. І гэта не выпадкова, бо хлеб – галоўны прадукт харчавання і аснова жыцця. Слова ***жыта*** ў розных значэннях – хлеб на корані і інш. – паўсюдна вядомае. А памяшканне для захавання збожжа ў славян здаўна называлася жытніцай. І зараз мы вобразна так называем урадлівую вобласць, край, якія даюць краіне збожжа.

Слова ***пшаніца*** таксама праславянскае па паходжанні. Утворана яно пры дапамозе суфікса ***–іц-а*** ад слова ***“пшено”*** (беларускае ***проса***), якое ўяўляе сабой старажытную форму дзеепрыметніка прошлага часу ад дзеяслова ***“пхаці” – таўчы, пхаць.***

Акадэмія, універсітэт

Слова ***акадэмія*** паходзіць ад імя міфічнага героя Акадэма, у гонар якога была названа мясцовасць паблізу Афін, дзе ў IV ст. да н.э. была заснавана Платонам філасофская школа. У XVII ст. акадэміі пачынаюць ствараецца як навуковыя цэнтры. Англійская Акадэмія (Лонданскае каралеўскае таварыства) створана ў 1660 годзе. Французская – у 1666, Пруская (у Берліне) – у 1700, Пецярбургская – у 1724 г. Акадэмія навук Беларусі створана ў 1929 годзе. Зараз акадэмія – гэта не толькі вышэйшая дзяржаўная навуковая ўстанова, але і назва некаторых іншых ВНУ па спецыяльных галінах навукі.

Універсітэты ўзніклі ў сярэднія вякі ў гарадах, дзе ў школах былі настаўнікі, якія праславіліся сваёй вучонасцю. Менавіта да іх адусюль, у тым ліку з іншых краін, збіраліся слухачы. У чужой краіне яны станавіліся бяспраўнымі і безабароннымі, а таму і пачалі аб'ядноўвацца ў саюзы – універсітэты (ад лацінскага ***“універсітас” – сукупнасць)***. Сюды ўваходзілі настаўнікі, вучні, перапісчыкі кніг, гандляры пергаментам. Гэта было нешта накшталт асобнага цэха. Паступова універсітэты атрымалі ад каралёў правы і прывілеі, таму што вялікая колькасць прыезджых ажыўляла духоўнае жыццё, рамяство, гандаль. Пазней, з павелічэннем іх колькасці слова гэтае тлумачылі ўжо не як саюз, а як сукупнасць факультэтаў. Першыя універсітэты з'явіліся ў XII – XIII ст. у Італіі, Іспаніі, Францыі і Англіі.

Аспірант, кандыдат

У старажытнасці вялікія вучоныя мелі вучняў, галоўным лозунгам якіх было грэчаскае слова ***“аспіра”*** – імкнуся. Вучні імкнуліся пераняць ад настаўнікаў як мага больш ведаў, каб самім глыбей пранікнуць у таямніцы Сусвету. Слова ***аспірант*** паходзіць ад ***“аспіра”*** – чалавек, які імкнецца авалодаць ведамі. Зараз слова абазначае асобу, якая рыхтуецца да навуковай дзейнасці пры навукова-даследчым інстытуце або ВНУ.

У Старажытным Рыме кандыдатамі называлі асоб, якія шукалі выбарнай дзяржаўнай пасады. У час выбараў кандыдат павінен быў знаходзіцца на відным месцы, у белай тозе (кандызе) – знаку сумленнасці і незаплямленасці, каб усе выбаршчыкі добра бачылі яго. Адсюль і паходзіць гэтае слова. У пачатку XIX ст. у Расіі з'явілася вучоная ступень кандыдата, якая тады прысвойвалася лепшым выпускнікам універсітэтаў, а зараз – гэта малодшая вучоная ступень, якая прысуджаецца на падставе абароны дысертацыі. Лацінскае ж ***“кандзідатус”*** – адзеты ў белае.

Пра мовы і словы

Самай шматнацыянальнай краінай з'яўляецца Індыя. Яе насельніцтва карыстаецца 845 мовамі і дыялектаі. Затым ідзе Камерун – 262.

Самай вялікай азбукай лічыцца азбука Кампучыі – 72 літары. Самую вялікую колькасць прэфіксаў мае мова індзейскага племені тыламон (Паўночная Амерыка). Іх – 30. А вось у японскай мове 2 тысячы іерогліфаў. Насельніцтва ж Папуа – Новая Гвінея карыстаецца 1010 дыялектамі.

Самай складанай у свеце з'яўляецца граматыка мовы племені паўночнаамерыканскіх індзейцаў чыпавеяў. У ёй налічваецца каля 6 тысяч (!) дзеяслоўных форм. У эскімосаў з гэтым крыху прасцей – 63 дзеяслоўныя формы. Праўда, толькі цяперашняга часу. Назоўнікі адзіночнага ліку маюць 252 флексіі (канчаткі). А вось у турэцкай мове ўсяго адзін няправільны дзеяслоў. Затое ў англійскай такіх дзеясловаў налічваецца 194. Не кажучы пра тое, што напісанне слова істотна адрозніваецца ад яго вымаўлення. Тым не менш колькі тых, хто прагне авалодаць менавіта “інгліш”!

Памылка ў пунктуацыі каштавала амерыканцам гіганцкую суму грошай. Гэта адбылося ў лістападзе 1962 г. З-за пропуску злучка ў праграме для вылічальнай машыны касмічную ракету, якая стартавала з мыса Кенэдзі да Венеры, давялося неўзабаве знішчыць. А яна каштавала звыш 18 млн. долараў. Вось і мяркуйце пасля гэтага, ці патрэбна фізікам ды матэматыкам ведаць дакладна правапіс.

У цяперашні час некаторыя беларускія словы выступаюць уласнымі асабовымі назвамі, у той час як у мінулым мелі сваё значэнне. Напрыклад, Басалай – жартаўнік, Батура – балагур, Буката – булка хлеба, Вярэня – плецены кошык, Галец – дзяркач, Дойлід – зодчы, Кмець – разбойнік, Лавец – паляўнічы, Пушкар – артылерыст, Сніцар – гравёр, Трызна – памінкі, Чэрня – прыгонны, Шульга – ляўша...

Самым вялікім паліглотам быў, хутчэй за ўсё, Расмум Крысціян Раск (1787 – 1832), прафесар Капенгагенскага універсітэта. Ён размаўляў на 230 мовах і склаў слоўнікі і граматыкі некалькі дзесяткаў з іх. І пра італьянца Джузэпе Мецэфанцыі (нарадзіўся ў 1774 г.) хадзілі легенды як пра незвычайнага паліглота. І сапраўды, ён перакладаў са 114 моў і 72 дыялектаў, размаўляў на 39 і свабодна выкарыстоўваў больш за дзесятак. Адным з самых першых беларускіх паліглотаў быў Францішак Скарына.


Самы стары нацыянальны гімн – японскі. Яго тэкст складаецца з чатырох радкоў і напісаны ў IX ст. Самы доўгі нацыянальны гімн – грэчаскі. У ім 158 радкоў. Самы ж кароткі гімн – Іарданіі. У ім усяго толькі 4 словы.

Самае кароткае пісьмо напісаў В. Гюго. Ён хацеў даведацца, як прадаецца яго твор. У пісьме быў толькі адзін пытальнік. Пісьменніку адказалі пісьмом таксама з адным знакам – клічнікам, таму што твор “Адвержаныя” раскуплялі вельмі хутка.

Самы доўгі ліст напісаў індыйскі студэнт Парыкх свайму сябру. Калі скласці ўсе яго старонкі, то атрымаецца стужка ў 1875 м. А сябар адказаў лістом у 1, 5 км.

Самым хуткім чытальнікам з'яўляецца француз Рэне Трамоні. Ён дасягнуў адразу двух рэкордаў. Рэне прачытаў тэкст з хуткасцю 400 слоў у мінуту і зрабіў прамову з хуткасцю 563 словы ў мінуту.

Самым здольным стэнаграфістам з'яўляецца італьянец з Рыма С. Брукальеры. На чэмпіянаце свету па стэнаграфіі ў г. Люцэрне (Швейцарыя) ён змог запісаць без адзінай памылкі 180 слоў у мінуту.



МІНСКІ ГАРАДСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

220050, г.Мінск, праспект Ф.Скарыны, 8
Тэл.: 227-05-75



МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

220050, г.Минск, проспект Ф.Скорины, 8
Тел.: 227-05-75

№ 3-2258 ад 03.08.2000
ад 18.07.2000 № 516

Мінская гарадская арганізацыя Грамадскага аб'яднання
"Таварыства беларскай мовы імя Ф.Скарыны",
вул.Румянцава, 13 220005, г.Мінск

У Мінскім гарадскім выканаўчым камітэце разгледжана ваша заява аб правядзенні 15 жніўня 2000 года мерапрыемтва "Літаратурныя спатканні".

Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, а таксама ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб сходах, мітынгах, шэсцях, дэманстрацыях і пікетаванні", Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 09.09.1999 г. № 36 і рашэннем Мінскага гарвыканкама ад 17.12.1999 № 1330 вы маеце права правесці дадзенае мерапрыемства 15 жніўня 2000 года з 18 да 20 ў скверы імя Я.Купалы ля помніка паэту без стварэння перашкод пешаходнаму і транспартнаму руху і агульнай колькасцю ўдзельнікаў да 50 чалавек.

Канкрэтнае месца правядзення мерапрыемства ўзгадніць з ГУУС гарвыканкама.

Разам з тым, нагадваем, што захаванне грамадскага парадку і дзеючага заканадаўства ўдзельнікамі мерапрыемстваў забяспечваюць іх арганізатары, і што за парушэнне парадку арганізацыі і правядзення сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў, дэманстрацый, пікетаванняў і другіх масавых мерапрыемстваў прадугледжана адказнасць у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

В.а. нам. старшыні выканкама **Р. В. Рачкоўскі.**
Дзюкава 220 6-041.

"ВЫ НАША СВЕТЛАЯ МОЛАДЗЬ..."

На працягу ўжо многіх гадоў я з'яўляюся сталым падпісчыкам і чытачом "Нашага слова". "ЛіМ", "Полымя", "Наша воля", "Наша слова"... Без іх, як без блізкіх сяброў і дарагіх суразмоўцаў. ЯК І БЕЗ ЦЯЖКАЙ, але любімай выкладчыцкай працы, ужо не ўяўляецца паўсядзённае жыццё з году ў год. Амаль кожны нумар "Нашага слова" – як жывая, імклівая, трапяткая ластавачка, што трапіла ў твае рукі, і ты чуеш яе даверлівае, узрушана-гарачае сэрцабіццё. "Наша слова" – гэта сэрцабіццё "самай беларускай Беларусі", галасы, думкі і клопаты людзей розных заняткаў, прафесій, узростаў, паяднаных перакананнем, што здрада роднай мове – гэта здрада не толькі Бацькаўшчыне, але найперш сабе, як грамадзяніну Беларусі.

Прыемна ўсведамляць, што сярод падпісчыкаў і чытачоў газеты многа моладзі, студэнтаў, у тым ліку і маіх, - студэнтаў філалагічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А. С. Пушкіна. мяркую, што маладыя чытачы гэтай адзінай прафесійнай, лінгвістычнай беларускамоўнай газеты ў нашай краіне ўжо пераканаліся, што "Наша слова" дапамагае ім быць дасведчанымі па многіх пытаннях беларускай мовы, літарараттуры, гісторыі і спрыяе іх прафесійнай падрыхтоўцы. І што не менш важна – газета дапамагае і дапаможа яшчэ сваім маладым чытачам стаць сапраўднымі беларускімі гуманітарыямі і грамадазнаўцамі. У гэтым пераконваюся, прачытаўшы, напрыклад, нататку Ірыны Канапацкай, студэнткі БУК з Менска "Прэзентацыя "Нашага слова". Я ўпэўнена, што Ірына і яе сябры, як і ўсе чытачы "Нашага слова" студэнты-гуманітарыі, і не толькі яны, усе, хто далучыўся, дакрануўся да трапяткога "сэрцабіцця" роднай мовы, літаратуры, гісторыі праз гэту газету, ужо не здрадзяць ёй і свайму беларускаму шляху.

Нядаўна я працавала ў Дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Адшукала цікавыя, патрэбныя нам, але ўсё яшчэ невядомыя творы Змітрака Бядулі, пісьменніка, якому я абавязана, дарэчы, як і ўсё сучаснае беларускае літаратуразнаўства, новым, неперадузятым перачытаннем і асэнсаваннем яго спадчыны. ("Творчасць Змітрака Бядулі і стаўленне лірызму ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя" – тэма маёй дысертацыі, абароненай у 1986 годзе.) Сярод мноства цікавых і дарагіх мне архіўных знаходак – невядомы для сучаснікаў публіцыстычны артыкул Змітрака Бядулі "Да беларускага студэнцтва", які друкаваўся ў газеце "Беларусь" у 1919 годзе.

Няхай са старонак "Нашага слова" пагаворыць з вамі, "наша светлая моладзь, наша студэнцтва" (Змітрок Бядуля), мудры і ўзнёслы, упэўнены ў грамадзянскай сталасці і паслядоўнасці вашай класік беларускай літаратуры.

Зоя Мельнікава, дацэнт кафедры беларускага літаратуразнаўства Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С.Пушкіна.

"ДА БЕЛАРУСКАГА СТУДЭНЦТВА"

Да вас ідзець наша слова, дарослыя, інтэлігенцыя, моладзь Беларусі. Клічам вас да сваёй гасподы, да хаты роднай. Годзе працаваць на карысьць чужых, трэба дбаць аб сабе – аб сваім Народзе, аб свам краю.

Лёсам гістарычным вы прамушаны былі праз доўгія гады і яшчэ цяпер, дзеля здабыцьця вышэйшай асветы, пакідаць сваю родную зямельку. У вышэйшых школах з вас выходзілі дактары, інжынеры, адвакаты, аграномы, настаўнікі і інш., якія здабылі сабе славу ў розных галінах навукі. Вы працавалі на Маскоўшчыне, на Каўказе, у Сібіры, на Поўдні, а ўсё гэта ішло на карысць чужых культур, чужых народаў. А калі працавалі ў родным краю, дык усё роўна пад чужой вывескай.

Шмат сыноў з нашай зямлі пад уплывам мацнейшых народаў зусім асіміляваліся і, адрокшыся ўсяго роднага, парабіліся самымі заядлымі ворагамі беларускай справы. Вярнуўшыся назад у свой край, вельмі шкодзілі нам. Шмат хто дзеля кавалка хлеба, дзеле кар'еры і дзеле таго, што не знаходзілі поля да працы на роднай глебе, прымушаны былі нехаця працаваць для чужых. А некаторыя, аднак, не гледзячы ні на што, насколькі была можнасць, - як з прафесараў, так-сама і з студэнтаў, - дапамаглі нашай справе.

Гэтак было дагэтуль.

Але цяпер, калі адраджэнне нашага народу пачынае ўлівацца ў дзяржаўную форму, калі аб нас загаварылі на ўсенькім свеце, калі ў розных месцах пачало арганізоўвацца нашае Нацыянальнае Войска, пара і вам, беларускае студэнцтва, соль нашай інтэлігенцыі, вярнуцца да сваёй маці-Беларусі!

Сыны Зямлі нашай!

Праца вас чакае, праца гарачая, святая і неадкладная! Трэба адбудаваць сваю гаротную Бацькаўшчыну, не зважаючы ні на якія перашкоды з боку нашых ворагаў.

Наша простая, шчырая дарога, наша няспрэчная вялікая праўда ўсё пераможа!

Вызвалім нашага мазольнага і няшчаснага гарапашніка-хлебароба ад векавечнай цемры, пакажам яму дарогу да шчасця, да свету. Апавядаема яму аб тым, што ён – гаспадар сваёй зямлі, што ён павінен разбіваць жалезныя путы сваёй няволі, што ён павінен, як роўны на роўных, глядзець на ўсе народы зямнога абшару. І гэта будзе ваша вялікая заслуга.

Найвялікшы ўдзел у нашай святой працы павінны прыняць вы, наша светлая моладзь, нашае студэнцтва!

Вы пры шчырай, маладой энэргіі патрапіце так паставіць справу, што ў нас будуць і свае беларускія універсітэты, што вам не трэба будзе аддаваць сваёй навукі чужым краям і народам, а будзеце працаваць для сябе.

Наш край – вялікі і багаты. Шмат ёсць у нашай зямлі шчырага, нечапанага багацтва, характва-аздобы, спячых, захаваных скарбаў.

Ідзеце да сваёй гасподы, студэнцтво беларускае, ад шчырага сэрца клічам вас да працы! Мы ведаем, мы пэўны, што іскры гарачага пачуцця да ўсяго роднага ў вас не згаслі. Гэта быць не можа.

Мы пэўны, што вы не пакінеце сваёй старонкі ў яе сучасны гістарычны момант. Мы спадзяемся, што вы падымеце яе культурны і эканамічны заняпад да высокага ўзроўню, каб нам не было сорамна перад другімі народамі.

Ідзеце дадому, наша студэнцтва – ужо пара!

З. Бядуля.



Памяці Уладзіміра Караткевіча

У рамках IX Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" прайшоў дзень культуры Беларусі.

На зымку: у дзень Беларусі ля помніка Ўладзіміру Караткевічу прайшло тэатрэлізаванае прадстаўленне, прысвечанае памяці пісьменніка. Выступае сястра Ўладзіміра Сямёнавіча Караткевіча Наталля Сямёнаўна.

Фота Аляксандра Хітрова, БелТА.

"Літаратурны экспрэс - 2000"

Удзельнікі Міжнароднага праекту "Літаратурны экспрэс - 2000", якія наведалі беларускую сталіцу 9-10 ліпеня, былі прыняты ў мэрыі Менска. А затым больш за 100 літаратараў з 43 краін Еўропы наведалі радзіму народнага паэта Беларусі Янкі Купалы - Вязынку. Тут прайшло вялікае тэатрэлізаванае свята "Беларусь праз межы і стагоддзі", удзельнікамі якога сталі, як госці, так і беларускія літаратары.

На здымку: на літаратурным сваце ў Вязынцы выступае беларускі паэт Генадзь Бураўкін.

Фота Аляксея Мацюшкова, БелТА.

Сведкі вечнасці

У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адкрыта выстава "Сведкі вечнасці. Асоба ў прасторы і часе". Экспазіцыя створана з асабістых мемарыяльных рэчаў беларускіх пісьменнікаў 30-х -- 70-х гадоў.



На здымку: фрагмент экспазіцыі.

Фота Аляксея Камушэнка, БелТА.

Ці выкарыстаем мы свой шанец?

10 жніўня 2000 г. адбылася сустрэча начальніка Упраўлення адукацыі Мінгарвыканкама сп. М. С. Ціцянкова, начальніка аддзела агульнай сярэдняй адукацыі сп. А. В. Фраловай і старшыні гарадской Рады ТБМ імя Ф.Скарыны сп. А. М. Анісім. Асноўнае пытанне, якое абмяркоўвалася на сустрэчы, адкрыццё беларускамоўнай гімназіі ў цэнтры сталіцы. Сп. М. С. Ціцянкоў паведаміў, што рэальная дата адкрыцця такой гімназіі – праз чатыры гады на базе 19 або 23 СШ. Гэта з улікам таго, што сёння ўсе гімназіі пачынаюць працаваць цалкам адасоблена ад пачатковай школы. Аднак, падмурак будучай нацыянальнай гімназіі трэба закладаць сёння. Такім чынам, бацькі сённяшніх вучняў падрыхтоўчых класаў атрымліваюць рэальную магчымасць забяспечыць сваім дзецям добрую беларускамоўную адукацыю.

У ходзе абмеркавання сп-ні А. М. Анісім была перададзена інфармацыя на рускай мове аб колькасці заяў, прынятых у падрыхтоўчыя класы г. Менска па мовах навучання на 2000/2001 нав. г. (па стану на 7 жніўня). Прывядзём звесткі па колькасці заяў на беларускамоўнае навучанне.

Раёны	№ школы	Беларуская мова навучання. Колькасць заяў на жнівень 2000 г.
Заводскі		161
	СШ 8	7
	СШ 68	15
	СШ 109	9
	СШ 111	87
	СШ 131	35
	СШ 210	8
Ленінскі		40
	СШ 2	38
	СШ 15	2
Кастрычніцкі		69
	СШ 11	18
	СШ 89	19
	СШ 90	1
	СШ 110	31
Маскоўскі		47
	СШ 39	5
	СШ 60	42
Партызанскі		45
	СШ 72	38
	СШ 108	7

Раёны	№ школы	Беларуская мова навучання. Колькасць заяў на жнівень 2000 г.
Першамайскі		87
	СШ 84	16
	СШ 190	12
	СШ 191	10
	СШ 49	1
	СШ 137	4
	СШ 177	4
	Гімназія 9	40
Савецкі		27
	СШ 19	12
	СШ 23	15
Фрунзенскі		77
	СШ 38	6
	СШ 81	3
	СШ 96	1
	Гімназія 4	64
	СШ 156	1
	СШ 211	1
Цэнтральны		20
	Маст. ліцэй 26	20
Разам:		573

Трэба адзначыць, што прычынай невялікай колькасці заяў на беларускую мову навучання з'яўляецца недастатковая інфармаванасць бацькоў. У прыватнасці, пра гэта думаецца, калі даведваешся пра тое, што напрыклад у 10 гімназію, якая знаходзіцца ў мікрараёне Паўднёвы Захад, не паступіла ніводнай заявы на беларускамоўнае навучанне. Відавочна, бацькі, ведаючы аб тым, што ў мінулым годзе не было набору дзяцей у беларускія класы ў гэтую навучальную ўстанову, сёлета проста туды не пайшлі. Варта адзначыць, што у мікрараёне Паўднёвы Захад і Малінаўка склалася дзіўная сітуацыя: на значную колькасць насельніцтва, учарашніх выхадцаў з вёскі – ніводнай беларускай школы, гімназіі і ліцэя. Такая сітуацыя не можа не трывожыць. І ў гэтым плане варта як след папрацаваць і ТБМ, і ўпраўленням адукацыі.

У сувязі з дадзенымі фактамі звяртаюся да бацькоў сённяшніх вучняў падрыхтоўчых класаў: калі Вы яшчэ не вызначыліся, у якую школу ці клас хацелі б аддаць сваё дзіця, звярніце ўвагу на беларускамоўныя класы і школы. Звяртаемся да бацькоў, якія падалі заявы на рускаю мову навучання ў сярэдніх школах №№ 8, 109, 210, 15, 90, 39, 108, 190, 191, 177, 137, 49, 19, 38, 81, 96, 156, 211, школу-ліцэй 16. Дарагія бацькі, калі ласка, перапішыце свае заявы, на беларускую мову навучання, бо ў азначаных школах могуць быць не адчынены беларускамоўныя класы ў сувязі з малой колькасцю навучэнцаў. Нашым дзецям жыць у XXI ст. Не адбірайце ж у іх права быць сапраўднымі патрыётамі, свядомымі грамадзянамі нашай цудоўнай Радзімы – Беларусі.

З усімі пытаннямі па гэтых праблемах звяртайцеся ў сядзібу ТБМ імя Ф. Скарыны: вул. Румянцава, 13, тэл. 284-85-11.

Старшыня гарадской Рады ТБМ імя Ф.Скарыны А. Анісім.

А нас усё судзяць...

(А суддзі хто?!)

Доўгі марафон чарговага цыркавога спектаклю сучаснага беларускага рэжыму пад назвай "Суд над Чыгіром" падыйшоў да фінішу. 19 траўня суддзя Васілевіч зачытвае прысуд, выконваючы загад САМАГО па палітычным знішчэнні ні ў чым не вінаватага крышталёва чыстага і тым вельмі небяспечнага чалавека.

Па ўсталяванай традыцыі блюзнерства і здзекаў з людзей, улады зрабілі ўсё, каб на АДКРЫТЫ суд ніхто не трапіў. Шчыльныя шэрагі АМАПаўцаў, добра адкормленых рэжымам, перакрылі ўсе ўваходы, жорстка спыняючы любую спробу простага грамадзяніна прайсці ў залу суда. Прапусцілі толькі супрацоўнікаў замежных пасольстваў, некаторых журналістаў, апошнія мейсцы занялі коратка стрыжаныя хлопцы ў скураных куртках. Такім чынам некалькі соцень людзей засталіся стаяць на вуліцы прыніжаныя і абражаныя.

Мы ўсе разам некалькі разоў выгукнулі: "Свабоду Чыгіру!". Тут жа палкоўнік міліцыі загадаў схапіць маладого хлопца Змітрака Марчука, выбраўшы яго мабыць з-за прыгожага бел-чырвона-белага значка на грудзях. На маё патрабаванне назваць сябе і патлумачыць, за што схапілі хлопца, палкоўнік загадаў двум міліцыянтам: "Узяць і гэтага!"

Прывезлі нас у трэцюю гарадскую ўправу міліцыі. (Цікавы факт: перад уваходам стаяла даволі многа маладых шараговых міліцыянтаў. На вокліч З. Марчука "Жыве Беларусь!" яны дружна выгукнулі: "Жыве!").

Па загаду вышэйшага начальніка лейтэнант Павел Алексіёнак рухава настрачыў на нас пратаколы. Аказалася, нас затрымалі за тое, што мы на вуліцы "ругались матом" і "приставали к прохожим". Пасля трох гадзінаў чакання нас "прыняў" падпалкоўнік А. Гардаш, які ў грубай форме катэгарычным тонам загадваў нам стаяць перад ім, не дазваляючы прысесці. Аб'явіў вырак: па 5200 р. штрафу, вельмі шкадуючы, што не можа даць больш.

Прайшоў час. 15 чэрвеня мне патэлефанаваў маёр міліцыі Анатоль Амельчанка і вельмі ветліва папрасіў прыехаць у міліцыю. Аказалася: "Лейтенант Алексиёнак хорошо не ознакомился с рапортом задержания и составил протокол по СТАНДАРТУ". Тут жа папрасіў падпісаць новы вырыянт пратаколу, дзе мы ўжо не "ругались матом", а толькі "скандировали: Свободу Чигирю". Меру пакарання цяпер павінен вызначыць суддзя.

Цераз тыдзень, 22 чэрвеня А.Амельчанка зноў па тэлефоне, і зноў вельмі ветліва запрасіў прыйсці ў суд Фрунзенскага р-на. Змітрок адмовіўся пайсці, а я сказаў, што пакольні я паабяцаў маёру, што прыду, то мушу пайсці.

Суддзя Сцяпанава Вікторыя Аляксандраўна на маё патрабаванне весьці справу на дзяржаўнай беларускай мове абурана ўсклікнула: "Неужели вы не понимаете русского языка?!" На заўвагу, што я беларус і жыву дома, на Беларусі, а не ў Варонежскай губерні, спадарыня Сцяпанава дэманстратыўна падціснула губы і доўга пачырванеўшы маўчала. "Хорошо", – выціснула нарэшце скрозь зубы, – "будет вам переводчик".

Тры жвавыя дзяўчынкі ў сакратарыяце на прапанову выпісаць мне позву на наступны суд на беларускай мове доўга хіхікалі і перашэптваліся. А на заўвагу, што рускамоўную я не вазьму адна з іх істэрычна-пагрозліва выкрыкнула: "Вот составим сейчас на вас протокол за неуважение к суду! Ишь, националист кокой нашолси!" Менавіта так: "националист кокой". Пайшоў я, дзецюкі, і адчуваў і адчуваю, як каляхуе ў душы абурэнне і горыч. Людзі, беларусы! Дакуль жа цярпецьмем!

Самі нараджаюцца горкія радкі:

Чужынцы бязродныя і нашы манкруты
Які ўжо год і які ўжо век
Нясуць у наш дом паасобку і гуртам
І гвалт, і знявагу, і кпіны, і здзек...

Чакаю позву ў суд. Ці маёр за мной на "варанку" прыедзе з кайданамі.

Суды працягваюцца...

Ян Грыб, жыхар г.Менска, пенсіянер.

ЛІТАРАТУРНАЯ ГАСЦЁЎНЯ ЧЭРЫКАЎСКАГА ТБМ

НЕ МАГУ БЕЗ БЕЛАРУСІ

Мая мілая радзіма!.. Я не магу без цябе ніводнай хвіліначкі. Ты самая дарагая, самая цудоўная, самая блізкая... І ніякая больш зямля, няхай яна будзе з неверагодным багаццем, не можа параўняцца з рэкамі, азёрамі, лясамі любай Беларусі. Тут я нарадзіўся, спазнаў першыя радасці і нягоды жыццёвага шляху, тут я адчуў сябе беларусам. І для мяне гэта даражэй за ўсё.

Вабіць вочы пахучая канюшына, п'яняць сваёй бялюткасцю рамонкі, а налітыя сокам яблыкі так і просяцца кожнаму ў рот. Прыгожая летняя пара. Менавіта, зараз квітнее наша дарагая Бацькаўшчына. Менавіта, зараз бачны ўсе чароўныя бакі гэтай выбранай Богам зямлі. Прыгожа, ці не так?

У ціхай плыні Сожа бачны думкі людзей, іх памкненні, разважанні, мары, іх жыццё. Вада павольна плыве некуды далёка-далёка. Рака таксама думае. Маю душу апанавала радасць, радасць служэння беларускаму народу. Няхай я пamру, няхай не здабуду за ўсё сваё жыццё ніякага багацця, але ў мяне ёсць найвялікшае багацце – мой народ. Ён, калі будзе такая патрэба, захіне мяне ў цяжкія часіны, надасць упэўненасць маёй душы, падбадзёрыць мяне. Таму, калі б у мяне спыталі, якія народы люблю больш за ўсё, я б адказаў, што люблю ўсе, але найбольшая любоў і пяшчота апаноўвае маё сэрца, калі я чую ўзнёслае і высокае: "Беларускі народ".

Ціхая і сонечная Беларусь. Такая рахманая, паслухмяная і добрая. Ці ёсць яшчэ дзе-небудзь такая зямля? З поўнай упэўненасцю магу сказаць: "Няма". Кожная краіна прыгожая і адметная нечым сваім, толькі ёй адной уласцівым. Але, якімі б прыгожымі ні былі гэтыя землі, яны не могуць замяніць простай і Боскай сутнасці маёй Бацькаўшчыны. Яна самая любая і дарагая ў маім сэрцы. Як і блакітныя вочы вясёлых беларусачак, што летнім вечарам пускаюць вянкі па вадзе, што гадаюць на рамонках аб пачуццях свайго мілага і адзінага, што прагледжваюць вочы, не спяць начамі, каб хоць раз убачыць сваю мару.

Што са мной стала? І даўно такое здарылася, з самага дзяцінства. Я не магу без сваёй Беларусі. Не імкнуся да ўлады, не прагну грошай. У мяне самая вялікая ўлада, і дала яе мне радзіма. Гэта ўлада над сваім сэрцам, душой, думкамі, якія ўпэўнена набылі рысы беларускасці.

Мой дарагі народ, ты клічаш мяне ў далёкую і недасягальную краіну – краіну шчырых беларусаў. Ты са старонак гістарычных кніг вітаеш мяне імёнамі Рагнеды, Ларысы Геніюш, Кастуся Каліноўскага, Максіма Багдановіча, Яўгеніі Янішчыц.

І я кожны раз, калі мне цяжка і невыносна, з крыкам у грудзях звяртаюся да сваёй радзімы, імя якой – Беларусь.


Станіслаў Хахлоў, старшыня Чэрыкаўскай гарадской арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, старшыня раённага клуба творчай інтэлігенцыі "Натхненне".

Я хачу каб, народ маю песню запеў

Выстава "Я хачу, каб народ маю песню запеў..." адкрыта ў літаратурным музеі Янкі Купалы ў Менску ў дзень нараджэння паэта.

На здымку: на выставе ў літаратурным музеі Янкі Купалы.
Фота Валерыя Харчанкі, БелТА.





Чарговы наскок на беларускае нацыянальна-культурнае адраджэнне?

Як вядома, у 20-я гады працэс беларусізацыі набыў шырокі размах, і бальшавікі, напалоханыя гэтым, зрабілі ўсё, каб спыніць наша адраджэнне. Была рэпрэсавана нацыянальная інтэлігенцыя, асабліва мовазнаўцы і пісьменнікі. Беларускую мову загналі ў расейскамоўнае рэчышча, замацаваўшы гэта нават афіцыйна пастановай Саўнаркама БССР 1933 года, праўда, завуаляваўшы г.зв. правапісным удакладненнем. А каб вынішчыць супраціў, паслалі кіраваць Беларуссю свайго стаўленніка П. Панамарэнку, які ўзначаліў кампартыю Беларусі. Ён вёў тут хітрую палітыку, нацкоўваючы беларусаў адзін на аднаго. Добра вядомы яго ліст да Сталіна пад назваю "О белорусском языке, литературе и писателях", абнародаваны ў газеце "Літаратура і мастацтва" 15.10.1993 года. Сакратар ЦК КПБ называе "дикими" многія адмысловыя беларускія словы: ***адукацыя, гонар, гадавіна, змагар, неўміручасць, сябар*** ды інш.

У другой палове 90-х гадоў, у час дэбеларусізацыі, абаронцы так званай "стабільнасці беларускай мовы", зноў сталі заганяць беларускую мову ў расейскае стойла. Найбольшым ворагам гэтых "абаронцаў" стала маўленчая практыка адраджэнцкіх гадоў, на аснове якой складваюцца нормы нацыянальнай беларускай мовы. Усім добра вядомы ліст-скарга А. Жураўскага на беларускамоўную газету "Наша Ніва". Яе рэдактару С. Дубаўцу давялося абараняць газету ў Вярхоўным гаспадарчым судзе. А. Жураўскі змушаў газету вярнуцца да стану 30-х гадоў.

Потым – артыкул П. Шубы ў часопісе "Роднае слова" (1997, № 10) пад красамоўным загалоўкам "Польскі ўплыў на мову беларускамоўных сродкаў масавай інфармацыі". У ім загадчык кафедры расейскай мовы БДУ змагаўся за выкараненне з беларускай мовы такіх беларускіх слоў, якіх не мае расейская мова: ***гульня, дзятва, доўжыцца, нагадаць, намеснік, іхні, ягоны, дзіцячы садок*** і інш., патрабуючы замяніць іх г. зв. традыцыйнымі /савецкімі/ ***ігра, дзетвара*** ды падобнымі.

І вось чарговы наскок – публікацыя І. Лепешава ў "Настаўніцкай газеце" з прэтэнцыёзным загалоўкам "Татальная рэвізія мовы". Чытаеш гэта і адчуваеш атмасферу 30-х рэпрэсіўных гадоў. Але гэтым разам замест прамога ўдару па сродках масавай інфармацыі ўзяты больш хітры, казуістычны спосаб: у ім абвінавачваюцца нібыта не сродкі інфармацыі, а ўсяго адзін чалавек – "калега па працы" І. Лепешава, аўтар кнігі "Праблемы нормы, культуры мовы" П.Сцяцко, які "*адназначна навязвае чытачу сваю пазіцыю*", "*насільна ўмешваецца ў маўленчую практыку*", "*рашуча ўкараняе ў практыку свае папраўкі*"...

А вось І. Лепешаў "*за стаўленне да роднай мовы як да нацыянальнай святыні, усебаковае развіццё і захаванне яе чысціні і самабытнасці" (?!)* А што мы бачым на самой справе? Ён выступае супраць адмысловых беларускіх слоў, якія назапасіла адраджэнская моўная практыка, ён за традыцыйныя моўныя сродкі", як і А. Жураўскі і П.Шуба, і ўхвальна ставіцца да іх дапісаў. Недарэмна і ў гэтай публікацыі ён кваліфікуе надпісы (на плакатах) ***"Адраджэньне", "Вызвольны рух"*** як небеларускія, якія дыскрэдытуюць мову ў вачах і без таго "*маленькай жменькі яе носьбітаў*". І гэта пры тым, што нават паводле афіцыйнага перапісу насельніцтва Беларусі 86%-беларусы і 37% з іх размаўляюць дома на сваёй роднай мове. І. Лепешаў крытыкуе не так нашага знакамітага адраджэнца Паўла Сцяцко, як адраджэнскі друк, які аналізуе П.Сцяцко, выяўляючы на яго старонках натуральныя беларускія словы і іх формы і выступаючы за іх падтрымку. Дый ці можа адзін чалавек навязаць мове, маўленчай практыцы свае словы, рэкамендацыі? Успомнім, як К.Крапіва, А. Падлужны, П. Шуба, А. Жукоўскі навязвалі сваю волю чытачам на выкараненне з маўленчае практыкі такіх слоў, як ***нагадаць, напой, выстава, распавядаць, напрыканцы*** ды інш., але нацыянальны друк і сёння актыўна імі карыстаецца.

Мэта артыкула – не так зняславіць аднаго з найбольш аўтарытэтных навукоўцаў змагара за беларускае нацыянальна-культурнае адраджэнне Паўла Сцяцко, як нанесці ўдар па нацыянальнаму друку, які выкарыстоўвае згаданыя даследчыкам словы. Адзіным доказам І. Лепешава, трэба ці не трэба выкарыстоўваць тое ці іншае слова, з'яўляецца спасылка на фундаментальную картатэку Інстытута мовазнаўства АН Беларусі: калі яно там ёсць – усё добра, калі няма – гэта парушэнне стабільнасці, унармаванасці мовы. Але ж успомнім, што пісаў пра гэтую картатэку сам дырэктар таго ж інстытута А. Падлужны ў адным з артыкулаў у газеце "Літаратура і мастацтва": ён казаў, што апошнім часам з-за недахопу сродкаў картатэка не папаўняецца новымі карткамі. Вось і атрымліваецца, што названая картатэка адлюстроўвае не сённяшнюю маўленчую практыку, а ранейшую – 30-80 гадоў, калі моўная трасянка была прэстыжнай у мове. На падставе яе і быў напісаны Тлумачальны слоўнік і іншыя, пра якія Максім Танк пісаў: "*Узяўся гартаць слоўнік. Бясконцая і бяздумная запазычанасць чужых слоў, як у нас, не можа не пагражаць дэградацыяй самой мове*" (Полымя. 1997.№6.С.161). Свае адказы І. Лепешаву даў сам Павел Сцяцко, якія павінны быць надрукаваны ў той самай газеце, мне ж хочацца звярнуць увагу на тое, як у розных мясцінах публікацыі І. Лепешаў сам сабе пярэчыць. З аднаго боку, ён нібыта за ўсебаковае развіццё і захаванне чысціні і самабытнасці беларускай мовы (цытуе са статуту ТБМ), а з другога – "*хоць бы захаваць тое, што напрацавана ранейшымі пакаленнямі, закансерваваць мову*" і нават, "*каб яна памерла ў такім стане, а ўжо потым уваскрэсла зноў*". Вось чаму лейтматывам усяго дапісу – даказаць, што "ў цяперашнім стане беларуская мова такая ж унармаваная, як і іншыя развітыя літаратурныя мовы". Але ж калі трэба запярэчыць Паўлу Сцяцко пры яго апоры на народную мову, то І. Лепешаў ужо сцвярджае адваротнае: "*... бо і ў сённяшніх гаворках тая самая трасянка*". Дык як жа можна такую трасянку лічыць унармаванай літаратурнай мовай? Як можна змагацца супраць адраджэння нашай мовы? Успомнім словы Максіма Танка: "*Зараз наша мова, якая доўгі час была і ў загоне, і прыгоне, патрабуе грунтоўнай рэстаўрацыі і ачышчэння ад розных непатрэбных запазычаннасцяў*" (Полымя.1997. №12.С.69).

З надрукаванага дапісу выразна відаць, што І. Лепешаў супраць такіх адмысловых беларускіх слоў, як ***агмень, сэрцавы, паўтарачка і паўтарытонка, сціслы, першасны, судзіны, вуські, пяратрус, гурт*** ды іншых, а патрабае выкарастоўваць на іх месцы г.зв. "традыцыйныя (інтэрнацыянальныя, усесаюзныя) ***ачаг, сардэчны, палутарка, літаральны, сасуды, насякомыя, вобыск*** ды іншыя штучныя адпаведнікі адмысловых беларускіх слоў. З гэтай пазіцыі ён раней пляжыў знакамітага адраджэнца З. Санько, які ў сваім слоўніку прыказак, прымавак і фразеалагізмаў спрабаваў да расейскіх моўных адзінак падаць адмысловыя беларускія адпаведнікі. А нядаўна І. Лепешаў абраў мішэнню свайго нападу яшчэ аднаго вельмі актыўнага адраджэнца – Уладзіміра Содаля, спрабуючы паказаць апошняму сваё месца.

З надрукаванага дапісу вынікае, што І. Лепешаў нічога не прымае з надрукаванага Паўлам Сцяцком і лічыць яго працу – дзве салідныя манаграфіі і больш за сто артыкалаў – усяго толькі "татальнай рэвізіяй мовы". Але ж чаму такія папулярныя ў сучасным нацыянальным друку напрацоўкі гэтага навукоўца і педагога? Чаму чытачы так часта звяртаюцца ў рэдакцыю "Нашага слова" з пытаннем, дзе можна набыць кнігі Паўла Сцяцко, і так непакояцца, калі не выходзіць рубрыка (ў газеце) "З чужой моўнай практыкі"? І яшчэ: чаму І. Лепешаў рашыў "адклікнуцца на кнігу П. Сцяцко "Праблемы нормы, культуры мовы" толькі на трэцім годзе па яе выхадзе з друку? У публікацыі І.Лепешава дарэчы, нічога не гаворыцца пра другую кнігу Паўла Сцяцко – "Праблемы лексічнага нармавання беларускай мовы", хоць матэрыялы для свае крытыкі І. Лепешаў бярэ якраз з гэтае кнігі, мусіць таму, каб чытач не змог запярэчыць яму, прачытаўшы нататкі аўтара кнігі. Здзіўляе найперш тое, што кнігі Паўла Сцяцко, якія атрымалі дагэтуль такую высокую ацэнку спецыялістаў, нацыянальнай інтэлігенцыі (выдавецкі аддзел Гродненскага ўнівесітэта, як згадвалася ў друку, мае шмат заказаў на кнігу Паўла Сцяцко), пра няабходнасць яе перавыдання пісалі рэспубліканскія газеты "Звязда" і "Літаратура і мастацтва" 4 сакавіка гэтага года, раптам узяўся пляжыць яго "калега па працы" І. Лепешаў? Згадаем тут хоць бы загалоўкі рэцэнзіяў на кнігі П.Сцяцко: "Дзеля нашага нацыянальна-культурнага адраджэння, захавання нас як нацыі". ("Наша слова, 6 і 13 траўня 1998 года), "З руплівасцю і клопатам пра рорднае слова" ("Роднае слова". 1998. №10). У вялікім артыкуле "Служэнне роднаму слову" (Полымя. 1999.№1) Алесь Каўрус прысвяціў Паўлу Сцяцко, аналізу яго кнігі "Праблемы нормы, культуры мовы" 16 старонак. Тут бачым такую ацэнку гэтай працы: "*Калі гаварыць пра змест кнігі "Праблемы нормы, культуры мовы" ў самых агульных рысах, то можна сказаць, што ея аўтар выклаў свой праект удасканалення мовы. Гэты праект заслугоўвае ўвагі і пры вывучэнні курса беларускай мовы студэнтамі-філолагамі, і пры напісанні граматык, фармуляванні правілаў арфаграфіі і ў штодзённай працы ўсіх, хто мае справу з беларускай мовай – журналістаў, пісьменнікаў, выкладчыкаў*". Гэты артыкул успамінае і І. Лепешаў, але толькі таму, што там А. Каўрус выказвае некаторыя пажаданні аўтару кнігі. У публікацыі І.Лепешава, аднак, не бачым успомненай высокай ацэнкі кнігі П. Сцяцко, нават няма ў ёй назвы артыкула "Служэнню роднаму слову", бо апошняе не служыла б ганьбаванню "свайго калегі па працы". Ужо адно гэта паказвае тую "аб'ектыўнасць" звестак, выкладзеных у дапісе "Татальная рэвізія мовы". Калі б факты, выкладзеныя ў гэтым дапісе, мелі месца, то не друкаваліся б так часта артыкулы П.Сцяцко ў часопісе беларускіх пісьменнікаў "Полымя", якія добра ўсвядамляць тыя "нормы", якія навязвалі беларускай мове ў час бальшавіцкай імперыі.

Крыўдна і балюча бачыць і чытаць усё гэта ў публікацыі прафесара І. Лепешава пра "свайго калегу па працы" – загадчыка кафедры беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства Гарадзенскага універсітэта імя Янкі Купалы, доктара філалагічных навук, прафесара Паўла Сцяцко, 70-годдзе якога так годна адзначылі ў Беларусі 5 сакавіка 2000 года. З гэтае нагоды апублікавана 10 юбілейных артыкулаў пра П. Сцяцко ў аўтарытэтных часопісах і газетах Рэспублікі Беларусь. Напомнім некаторыя іх красамоўныя загалоўкі: "Карыфей айчыннага мовазнаўства" (Звязда. 4.03.2000), "Рыцар вяльможнага слова" (Літаратура і мастацтва. 3.03. 2000), "Слынны навуковец і педагог, усебакова дасведчаны і глыбокі даследнік" (Наша слова. 8.03.2000) ды іншыя.

Дарэчы, не так даўно (23.10.1999) быў юбілей (75 гадоў) Івана Лепешава, пра які нагадалі "Роднае слова" і "Наша слова". Здаецца, больш нідзе пра прафесара І. Лепешава не пісалі. Можа, гэта і сталася прычынаю нападу на "калегу па працы", юбілей якога значна лепш адзначылі ў сродках масавай інфармацыі, і таму Іван Якаўлевіч і пакрыўдзіўся на гэтыя СМІ, рашыў адпомсціць ім.

Як бы там ні было, а допіс І.Лепешава "Татальная рэвізія мовы" ганьбіць толькі самога аўтара яго, ставіць прафесара ў шэраг з такімі "змагарамі" за "традыцыйную мову", як А. Жукоўскі, П. Шуба. А калі ўспомніць ранейшыя гады, то і з Панамарэнкам, які змагаўся не за беларускую мову, а супраць яе.

Максім Каліноўскі.

Памяць

У 1944 годзе, 19 чэрвеня, за дзесяць дзён да прыходу Савецкай Арміі, вёску Дальва Лагойскага раёна, і 44 яе жыхароў, жывымі спалілі нямецка - фашысцкія акупанты.

Памяці загінуўшых была прысвечана памінальная служба, якая адбылася ля помніка, пастаўленага на месцы трагедыі.

На здымку: у Мікалая Пятровіча Гірыловіча загінулі ў тыя дні ў Дальве ўсе яго родныя.

Фота Аляксея Мацюшкова, БелТА.





Вайсковая гісторыя Беларусі ў пытаннях і адказах

Р. Паўловіч, малодшы навуковы супрацоўнік аддзела вайсковай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі

Ці былі на Беларусі рачныя вайсковыя флатыліі?

Так, былі (усяго 5: 1 Польская Пінская флатылія (з 1931 г. афіцыйна называлася Рачная флатылія вайскова-марскога флоту) і 4 савецкіх: рачная Заходне-Дзвінская вайсковая флатылія, рачная Прыпяцкая вайсковая флатылія, рачная Пінская вайсковая флатылія і рачная Дняпроўская вайсковая флатылія).

Як вядома, у лютым 1919 г. пачалася савецка-польская вайна. Ужо ў сакавіку 1919 г. польскія войскі Падляшскай групы пад камандаваннем дывізіённага генерала Антона Лістоўскага ўзялі Пінск і прасунуліся далей углыб Палесся, дзе было мала дарог, але існавала развітая рачная сетка, якая шырока разлівалася ў час веснавых паводкаў (у народзе гэта з'ява атрымала назву "Пінскае мора"), затрымлівала рух і забяспячэнне войск, а таксама сувязь паміж імі. У гэтых умовах 19 красавіка 1919 г. быў створаны рачны аддзел з чатырох маторных лодак, пакінутых пры адыходзе нямецкіх войск з Пінска, які наўмысна называлі "флатыліяй". Назву "Пінскай" яна атрымала ад месца свайго фармавання – г. Пінска. На пасаду камандуючага флатыліяй Лістоўскі прызначыў 19 красавіка 1919 г. былога афіцэра расейскага вйскова-марскога флоту Яна Гедройца. Першапачаткова гэта была транспартная група з дапаможнымі функцыямі (дастаўка, забеспячэнне, сувязь, разведка). Але пасля з'яўлення ў басейне Прыпяці савецкіх Дняпроўскай і Прыпяцкай флатылій, узнікла неабходнасць супрацьпаставіць ім адпаведныя польскія рачныя сілы. З гэтага моманту роля і задачы Пінскай флатыліі значна змяніліся. Акрамя транспартных задач, яна павінна была весці барацьбу з савецкімі флатыліямі і часткамі Чырвонай Арміі ў прыбярэжнай зоне, высаджваць дэсанты, падтрымліваць уласныя войскі ў наступленні і абароне. Па ходу ваенных дзеянняў Пінская флатылія пачала развівацца як аператыўна-тактычнае злучэнне, якое здольна праводзіць самастойныя заданні на флангах і перад лініяй фронту наступаючых войск, а таксама прыкрываць іх адыход і забяспечваць эвакуацыю водным шляхам. У гэтых умовах польская Віслінская флатылія, якая была створана яшчэ ў канцы 1918 г. з мэтай аховы польска-германскай дэмаркацыйнай лініі на р. Вісла і суправаджэння рачных перавозак паміж Варшавай і Гданьскам, стала, па сутнасці, базай для папаўнення Пінскай флатыліі асабовым складам і караблямі.

Улетку 1919 г. у раёне Прыпяці ішлі жорсткія баі частак Чырвонай Арміі з польскімі войскамі. На правым беразе ракі, у раёне Турава, утварыўся вялізны калідор паміж 8-й дывізіяй, якая дзейнічала на левым фланзе 16-й арміі і правым фланзе 12-й арміі. Гэтым калідорам карысталіся палякі для абходу флангаў Чырвонай Арміі і нанясення ўдараў з тылу. Таму камандаванне савецкага Заходняга фронту прыняло рашэнне арганізаваць на Прыпяці самастойную рачную ваенную сілу, якая ў аператыўных адносінах падпарадкоўвалася б камандуючаму 16-й арміі. Умовы для яе стварэння меліся, бо з красавіка 1919 г. на Прыпяці дзейнічаў аддзел суднаў (5 параходаў, 6 маторных катэраў і 11 караблёў невялікага танажу) пад камандаваннем чырвонаармейца Леаніда Асоўскага. Аддзел аператыўна падпардкоўваўся камандзіру 1-й брыгады 8-й дывізіі і выконваў задачы разведвальна-дазорнай службы, забяспечваў перавозку войскаў, харчавання, боепрыпасаў. Таму 16 ліпеня 1919 г. Рэвалюцыйны ваенны савет Заходняга фронту прызначыў Н.А.Ёкіша начальнікам Прыпяцкага аддзела караблёў, а 24 ліпеня ў Мазыр прыбыў аддзел вайсковых маракоў у складзе 90 чалавек для фармавання рачной Прыпяцкай вайсковай флатыліі. Сярод іх былі маракі-латышы з флатыліі Савецкай Латвіі, якая дзейнічала на Заходняй Дзвіне.

Вайскова-рачная флатылія Савецкай Латвіі была створана ў сакавіку 1919 г. для абароны Рыжскага заліва, вусця Заходняй Дзвіны, падтрымкі сухапутных войскаў і мела 2 аддзелы. 1-ы апіраўся на Рыгу, а 2-і – на Віцебск. 22 траўня 1919 г. германскія войскі аваладалі Рыгай, захапілі 1-ы аддзел, 2-і ж аддзел у лістападзе 1919 г. быў перафармаваны ў Заходне-Дзвінскую рачную вайсковую флатылію (4 ўзброеныя параходы, 4 катэры, 2 плаўбатарэі, 3 пасыльныя караблі, 4 дапаможныя параходы) з базай у Віцебску. Камандуючыя – В. Новак (лістапад 1919 г. – сакавік 1920 г.), Т. М. Тырышкін (сакавік – лістапад 1920 г.). Флатылія вяла баявыя дзеянні сумесна з войскамі 15-й арміі Заходняга фронту супраць польскіх войскаў у сакавіку – ліпені 1920 г. У лістападзе яна была расфармавана ў сувязі з заканчэннем ваенных дзеянняў, але з кастрычніка 1925 г. па студзень 1928 г. існаваў Асобны дывізіён бранякатэраў р. Заходняя Дзвіна, галоўнай базай якога з'яўляўся Віцебск.

Фармаванне Прыпяцкай вайсковай флатыліі, якая мела 2 галоўныя базы (г. Мазыр і ст. Калінкавічы), адбывалася ва ўмовах жорсткіх баёў супраць польскіх войскаў у раёне Турава. 26 ліпеня 1919 г. флатылія дапамагла часткам Чырвонай Арміі вызваліць Тураў ад палякаў, але ўжо ў пачатку жніўня польскія войскі актывізавалі свае дзеянні. 2 жніўня Рэўваенсавет Заходняга фронту прызначыў П.І.Пашкіна камандуючым Прыпяцкай флатыліяй, 10 жніўня ён заступіў на сваю пасаду, а Ёкіш быў прызначаны памочнікам Пашкіна і начальнікам берагавой базы флатыліі, г.зн. сумяшчаў дзве пасады. А 13 жніўня ў Мазыры быў аб'яўлены стан аблогі, у сувязі з захопам Слуцка і набліжэнні польскіх войскаў да Турава.

У гэты ж дзень пачалася эвакуацыя Мазырскага раёна. Караблі флатыліі дапамаглі ў час яго эвакуацыі і ахоўвалі ўчасткі ракі. Пад націскам польскіх войскаў, якія 24 жніўня пачалі наступленне на Тураў, аслаблены 64-полк, нягледзячы на падтрымку артылерыйскім агнём Прыпяцкай флатыліі, быў вымушаны 25 жніўня пакінуць горад. У сярэдзіне верасня польскія войскі нанеслі адначасовы ўдар па правым і левым берагах Прыпяці, захапілі Копцавічы і Астражанку, а 17-га пачалі наступленне ў раёне Петрыкава і здолелі авалодаць гэтым мястэчкам. Але 19 верасня 1919 г. флатылія разам з часткамі Чырвонай Арміі вызваліла Петрыкаў і прадухіліла захоп супраціўнікам Мазыра. На наступны дзень камандуючы Дняпроўскай флатыліяй П.І. Смірноў загадаў Пашкіну з усімі караблямі і асабовым складам адбыць у Гомель. 26 верасня 1919 г. караблі Прыпяцкай флатыліі пад камандаваннем П.І.Пашкіна прыбылі ў Гомель і ўліліся ў склад рачной Дняпроўскай вайсковай флатыліі.

Дняпроўская флатылія ўпершыню была створана ў 1737 г. у Бранску пад камандаваннем віцэ-адмірала Дз. М. Сянявіна. Яна складалася з дробных драўляных парусна-вёславых караблёў, якія сваімі дзеяннямі падтрымлівалі расейскія войскі ў час расейска-турэцкіх войнаў 18 стагоддзя, і фармальна праіснавала да 1789 г. Праз 130 год, у сакавіку 1919 г., у Кіеве была сфармавана флатылія з такой жа назвай з мэтай садзейнічаць у абароне і дапамагаць у наступленні сухаземным войскам Чырвонай Арміі. У верасні 1919 г. яна перабазавалася ў Гомель, папоўнілася караблямі Прыпяцкай флатыліі і вясной 1920 г. мела каля 40 баявых караблёў. Камандуючыя: А.В. Палупанаў, П.І.Смірноў, М. Г. Сцяпанаў. З красавіка 1919 г. вяла баі на Дняпры, Прыпяці, Бярэзіне, Сожы з польскімі войскамі і Пінскай флатыліяй. У траўні 1920 г. флатылія падзелена на 3 аддзелы: Бярэзінскі, Паўночны і Паўднёвы. Галоўным і найбольш моцным быў Паўночны аддзел на чале са Смірновым. Аддзел актыўна ўдзельнічаў у абароне г. п. Лоева, а калі часткі Чырвонай Арміі пачалі адыходзіць, ён быў вымушаны адыйсці па Сожы ў Гомель. У пачатку чэрвеня 1920 г. Паўночны аддзел вызначыўся ў аперацыі, якая ўвайшла ў гісторыю пад назвай Лоеўскі прарыў. Яе мэта – прайсці ад Гомеля (вусця р. Сож) уніз па Дняпры праз умацаваны раён супраціўніка каля Лоева і забяспечыць пераправу ўдарнай групы 1-й арміі Паўднёва-Заходняга фронту каля сутокаў Прыпяці і Дняпра. Каб увесці ворага ў зман адносна сапраўднага месца прарыву, маракі разам з партызанамі папсавалі яго лініі сувязі, разведалі праходы, напалі на суседнія польскія гарнізоны, наладзілі несапраўдную пераправу на поўнач ад Лоева. Ноччу 2 чэрвеня аддзел (5 кананерскіх лодак, 2 тральшчыкі, 2 пасыльныя караблі) пад агульным кіраўніцтвам камандуючага Дняпроўскай флатыліяй П. І. Смірнова па Сожы ад вёскі Карпаўка (па рацэ вышэй Лоева) падышоў да Лоева і на світанку з боем прарваўся праз умацаваны раён і ўчастак з разбураным мостам. Пры падтрымцы 57-й дывізіі кананерскія лодкі (2 з іх загінулі) дасягнулі вусця Прыпяці каля вёскі Печкі, дзе адбылася пераправа войск Чырвонай Арміі. З другой паловы чэрвеня 1920 г. пачаўся адыход польскіх войск з Украіны і Беларусі, які скончыўся толькі на лініі Віслы і Вепра, але ўжо 19 верасня палякі зноў пачалі наступленне на Беларусь. У рэшце рэшт 18 сакавіка 1921 г. у Рызе падпісаны мірны дагавор паміж Польшчай і Савецкай Расіяй, паводле якога Беларусь была падзелена на 2 часткі з рознымі грамадска-палітычным ладам. Беларускі народ быў гвалтоўна раз'яднаны.

Як жа надалей склаўся лёс Пінскай і Дняпроўскай флатылій? У выніку страты палякамі вусця Прыпяці быў перакрыты адзіны шлях да адступлення Пінскай флатыліі. Каб не дапусціць захопу караблёў супраціўнікам, экіпажы затапілі іх. Афіцыйна Пінская флатылія была расфармавана загадам галоўнакамандуючага Войска Польскага ад 4 жніўня 1920 г., а Дняпроўская – 21 сакавіка 1921 г., калі быў выдадзены аператыўны загад за № 0058 аб расфармаванні штаба флатыліі. Але ўжо пасля падпісання Рыжскага дагавора ў Польшчы было распачата аднаўленне Пінскай флатыліі. Карабельны склад расфармаванай у 1925 г. Віслінскай флатыліі быў перададзены ў Пінскую, якая базавалася ў Пінску і мела задачай ахоўваць водныя рубяжы Палесся. У кастрычніку 1925 г. у Кіеве быў сфармаваны аддзел караблёў Дняпроўскай флатыліі. З кастрычніка 1926 г. ён называўся "Асобны аддзел караблёў ракі Дняпро", а 27 чэрвеня 1931 г. перайменаваны ў Дняпроўскую вайсковую флатылію. Камандуючыя: М.В. Трацякоў, Б. У. Харошкін, Г. Н. Чубуноў. М. В. Абрамаў.

17 верасня 1939 г. часткі Чырвонай Арміі перайшлі савецка-польскую мяжу на ўсёй яе адлегласці. Аднак з-за нізкага ўзроўню вады Дняпроўская флатылія перайшла мяжу на дзень пазней. Камандуючы Пінскай флатыліяй камандор-паручнік Вітольд Заянчкоўскі атрымаў паведамленне аб уварванні частак Чырвонай Арміі ад кіраўніка аддзялення контрразведкі. Ён неадкладна выехаў да генерала Ф. Клеберга па загад. Клеберг чакаў рашэння з Варшавы, але сувязь з ёю адсутнічала. Загаду ваяваць з Чырвонай Арміяй і Дняпроўскай флатыліяй не было. Таму калі Заянчкоўскі заявіў Клебергу пра нізкі ўзровень вады, што выключала якія-небудзь дзеянні на Прыпяці, генерал палічыў неабходным неадкладна знішчыць караблі. 18 верасня пачалося другое і канчатковае самазатапленне караблёў польскай Пінскай флатыліі, якое скончылася 21 верасня. Такім чынам, польскія караблі не зрабілі ніводнага стрэлу па Дняпроўскай флатыліі і наадварот. З кастрычніка 1939 г. галоўнай базай Дняпроўскай флатыліі стаў г. Пінск, а паднятыя, адрамантаваныя, пераўзброеныя і перайменаваныя караблі былой польскай Пінскай флатыліі былі перададзены ў склад Дняпроўскай. Колькасць яе караблёў перавысіла 120.

У чэрвені 1940 г. да Малдовы далучана Бесарабія і паўднёвая мяжа СССР пашырылася. У сувязі з гэтым было прынята рашэнне расфармаваць Дняпроўскую флатылію і на яе базе стварыць 2 новыя: Дунайскую і Пінскую. 17 чэрвеня 1940 г. згодна з загадам народнага камісара ВМФ СССР адмірала флоту М. Г. Кузняцова за № 00184 пачалося стварэнне рачной Пінскай вайсковай флатыліі з галоўнай базай у Пінску і тылавой у Кіеве пад камандаваннем капітана 1 рангу (пазней – контадмірала) Дз.Дз.Рагачова. Варта падкрэсліць, што значную частку камандных і іншых адказных пасад у Пінскай флатыліі займалі беларусы і ўраджэнцы Беларусі. Так, аддзелам бранекатэраў камандаваў ураджэнец Віцебскай вобласці, старшы лейтэнант Міхась Іванавіч Халалееў. Начальнікам часткі забеспячэння Кіеўскага вайсковага порта быў ураджэнец Магілёўскай вобласці, капітан Міхась Трыфанавіч Васілеўскі, а старшым вайсковым фельчарам гэтага порта з'яўляўся ўраджэнец г. Слуцка, доктар-харчавік Хведар Яфімавіч Фядзюшка. 151-м стралковым звязам камандаваў ураджэнец Магілёўскай вобласці, малодшы лейтэнант Андрэй Сцяпанавіч Гайдук. Раніцу 22 чэрвеня 1941 г. флатылія сустрэла ў баявой гатоўнасці ля заходняй мяжы, але імклівае адступленне частак Чырвонай Арміі стварыла для яе пагрозу быць адрэзанай ад іх. Выходзячы з гэтага, камандаванне флатыліі перамясціла свой штаб у Кіеў, а караблі вялі абарончыя баі пад аператыўным камандаваннем камандуючага Заходнім фронтам. Але вораг працягваў імкліва наступаць. Яго войскі абыходзілі Прыпяцкую нізіну з двух бакоў. Таму ўзнікла неабходнасць выкарыстаць сілы флатыліі на шырокім фронце для больш усебаковай дапамогі Чырвонай Арміі. Выходзячы з гэтага, 11 ліпеня 1941 г. флатылія была падзелена на 3 аддзелы: Бярэзінскі, Дняпроўскі, Прыпяцкі. Апошні, у адрозненне ад двух другіх, пад камандаваннем капітан-лейтэнанта К.В.Максіменкі з ліпеня па жнівень не страціў ніводнага карабля, а яго манітор "Бабруйск" вызначыўся ў ліпені 1941 г.

(Заканчэнне ў наст. нум.)

Маю права падаць голас

Даведалася з "Нашага слова" пра збор подпісаў за адкрыццё нацыянальнага універсітэта Беларусі, за захаванне назвы галоўнага праспекта нашай краіны – імя Францішка Скарыны, а таксама пра наданне вуліцам Менска імёнаў выдатных дзеячоў гісторыі і культуры нашай дзяржавы – Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Францішка Багушэвіча...

Мяркую, што я маю права падаць свой голас і падпісаць гэтыя адозвы, бо мая Радзіма – Беларусь, дзе я нарадзілася і пражыла большую частку свайго жыцця, была грамадзянкай Беларусі і цяпер адчуваю сябе ёю. Прынамсі, пашпарт у мяне яшчэ СССР, значыць – і Беларусі. І самае галоўнае: усё маё жыццё было звязана з беларускім словам, бо я працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. Аднак лёс склаўся так, што зараз я не побач з тымі, хто рупіцца пра Адраджэнне, ды і ўзрост мой даволі паважны (маю 83 гады), але я імкнуся даведацца як мага больш пра Беларусь, прагна лаўлю кожнае слова па радыё і тэлебачанні, шукаю ў газетах і часопісах.

Некалькі слоў пра сябе.

Нарадзілася і вырасла ў мястэчку Крычаве. У 1922 годзе пайшла ў школу імя Чарвякова. Вучыліся мы па-беларуску. Настаўнікам роднай мовы быў дзядзька Кастусь (так мы яго звалі), настаўніцай прыродазнаўства – цётка Надзея. У старэйшых класах настаўнікаў называлі звычайна, як і зараз. Памятаю першы вялікі твор – паэму "Босыя на вогнішчы" Міхася Чарота. Я ведала яе на памяць. Цяпер думаю, што не так ужо добра разумела змест і сэнс твора, але вельмі спадабаліся рытмічнасць і своеасаблівая гучанне радкоў паэмы.

Мястэчка наша было беларуска-яўрэйскае, і мова беларуская была для нас сваёй мовай. Таму ў Мсціслаўскім Белпедтэхнікуме, куды я паступіла ў 1930 годзе, мы ўсе размаўлялі ў асноўным па-беларуску. І гэта было натуральна. А пісалі мы, кіруючыся правапісам Тарашкевіча. На мой погляд, гэты правапіс вельмі дакладна захоўваў асаблівасці вымаўлення, мяккасць, мілагучнасць мовы. Мне здаецца, што я і зараз без цяжкасцяў змагла б пісаць тарашкевіцай.

Пасля заканчэння педтэхнікума працавала настаўніцай беларускай мовы. Выпускнікоў нашых накіроўвалі ў розныя раёны Магілёўскай і Смаленскай вобласці, дзе таксама было шмат беларускіх школ, у якіх мы выкладалі беларускую мову.

Тут вось і пачаўся пераход на новы правапіс. Тлумачэнне было такое: зрабіць больш лёгкім авалоданне беларускай граматыкай і наблізіць яе да рускай. У гэты ж час загаварылі і пра нацдэмаў, якія "выдумляюць незразумелыя для беларусаў словы".

Мы, маладыя настаўнікі, не ўсё разумелі ў гэтых справах, але было вельмі трывожна. Падчас падрыхтоўкі да экзаменаў прыходзілі загады зняць з білетаў пытанні па творчасці таго ці іншага пісьменніка – і ніякіх тлумачэнняў пры гэтым! Мы ўжо ведалі, што вакол нас шмат ворагаў народа, але не знаходзілі і намёку на здраду Радзіме і варожасць у тым, што чыталі самі і чыталі нашы вучні. Мы думалі: "Што сказаць вучням?" І гаварылі адно: "Каб вам менш было вучыць да экзаменаў".

Пачалі знікаць па невядомых прычынах настаўнікі, лепшыя студэнты старэйшых курсаў навучальных устаноў.

Так пачалася русіфікацыя, так пачалося знішчэнне свабоднай грамадскай думкі. У тыя часы папулярным быў сярод настаўнікаў такі жарт: "У першым класе вучні чытаюць па складах: Б-а – ба, н-я – ня (баня) а ў выніку атрымлівалася слова ***лазня***". Так і было на самай справе. Напрыклад, трэба, прачытаць словы пад малюнкам: ***дом, крыша, аист***, а вучні ўпарта казалі: ***хата, дах, бусел***, бо гэта былі родныя, зразумелыя словы, ад якіх імкнуліся адвучыць маленькіх беларусаў.

У 1938 г. паступіла вучыцца ў Магілёўскі педінстытут, а скончыла ў 1945 г., пасля Вялікай Айчыннай вайны, Белдзяржуніверсітэт. І ўсё жыццё выкладала беларускую мову і літаратуру ў г. Пінску. Як вучыла моладзь роднаму слову – не мне меркаваць. Адно скажу: заўсёды было складана. Неяк прачытала ў "Нашым слове" артыкул М. Пузінскага пра беларускую мову, пра здзекі над ёй: "... і яна ў школе вывучалася як звычайны прадмет". Не, нават і так не было! У якой яшчэ краіне родную літаратуру вывучалі б не на сваёй мове? А ў нашых школах у 60-ыя гады беларускую літаратуру выкладалі, як замежную, на рускай мове.

Вось таму я сёння з тымі, хто змагаецца за роднае слова. Радуюся вашым пачынанням, кожнаму вашаму поспеху, вашым перамогам, бо гэта значная частка і майго жыцця, маіх думак, маёй душы.

Марыя Сафро, Расія, Маскоўская вобл.

Беларусы на Камчатцы

Вунь дзе апынулася 7 тысячаў нашых землякоў, аж на самым краёчку былога СССР.

Спадары гэтай суполкі ўжо маюць і свае білеты з эмблемай чорнага зубра. Цяпер ужо яны, гэтая частка землякоў, на пытанне: хто вы, адказваюць з гонарам: мы – беларусы. Але варта сказаць пра іх і ўсю праўду словамі К.Крапівы: "Здэцца робяць яны нешта, але справы слабы". Бо за шмат дзесяцігоддзяў сарганізавалі яны з 7 тысячаў толькі 90 чалавек, а пра іншых неяк забылі. То, калі ж тыя, іншыя, дойдуць да Беларусі?! (Адлегласць тут не пры чым). Вядома ж, без нацыянальнай свядомасці не дайсці. А дзе ж яе возьмеш, калі не было такой магчымасці паласавацца ёю. Нават першы перабудовачны час на Беларусі іх не закрануў. Значыцца, выпадку схапіць глыток чыстага нацыянальнага паветра ў іх не было. Таму, вось, і жывуць яны тут яшчэ з імперскім (незалежна ад колеру) закілзаным напластаваннем практычнай палітыкі.

Як прыклад гэтаму – выказванне аднаго спадара адмірала гэтай суполкі: мы з рускімі тысячагоддзямі жылі разам. Я, праўда, не запытаўся яго, калі і ў якой эры магло быць такое дзіва. Але найбольш мяне здзівіла і ўразіла, што ніхто з прысутных не пярэчыў адміральскай лухце. Выходзіць, усе яны былі з ім згодны. А ён, дарэчы выступаў за ўсіх і ад усіх. І кожнае ягонае слова было прысвечана толькі адной задуме, як хутчэй зацугляць Беларусь у абдымкі Расіі. Пасіўнасць грамады тлумачыцца адсутнасцю аб'ектыўнай, перадусім гістарычнай, інфармацыі, наогул, пра Беларусь. Чытаюць яны тут толькі адну газету "Голас радзімы". А мы добра ведаем, што гэта за газета. А, вось, выпісаць, хоцьбы і ў складчыну, яшчэ не дадумаліся. Выходзіць для нашых камчацкіх землякоў патрэбна аб'ектыўная літаратура, а яе няма. Ад сённяшняй нашай дзяржавы такой дапамогі яны не дачакаюцца. Таму я заклікаю ўсіх, хто мае магчымасці і годнасць патрыёта, высылайце аб'ектыўную літаратуру для станаўлення асобы патрыёта на наступны адрас: **Россия 683032, Петрапаўлаўск Камчацкі, ул.Пограничная 16, Кафе "Алеся" Гаврилову Виктору Александровичу**, або: **683000 Россия, Петропавловск Камчатский, Советская 35, Малашэнко Аляксей Дмитриевич.**

Антыкварыят і жывапіс 18-19 ст.



У Віцебскім абласным краязнаўчым музеі адкрылася выстава антыкварыяту і жывапісу 18 - 19 стагоддзяў з фондаў музея.

Сярод палотнаў -- работы вядомых майстроў пэндзля І. Крамскога, В. Паленава, І. Хруцкага і іншых. Арыгінальныя гадзіннікі, падсвечнікі,бюсты і іншы антыкварыят упрыгожвае экпазіцыю выставачнай залы.

На здымку: "Жаночы партрэт" і. Хруцкага.
Фота Аляксандра Хітрова, БелТА.



"Звіняць цымбалы і гармонік"

Невялікі гарадок на захадзе Віцебскай вобласці --Паставы стаў на некалькі дзён цэнтрам культурнага і музычнага жыцця краіны. Тут праходзіў V Міжнародны фестываль народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік". Лепшыя калектывы Беларусі, Расіі, Украіны і Летувы дэманстравалі сваё майстэрства.

На здымку: тэатрэлізаванаешэсце ўдзельнікаў фестывалю. Народны ансамбль "Мілавіца" Мышкавіцкага Дома культуры Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці.

Фота Аляксандра Хітрова, БелТА.



"Жалейка"

Ансамбль народнай музыкі "Жалейка, створаны тры гады назад пры Віцебскім цэнтры народных рамёстваў і мастацтваў "Задзвінне", стаў сваім для многіх школьнікаў абласнога цэнтру. Яны з задавальненнем іграюць на дудках, скрыпках, цымбалах і іншых народных інструментах. На фестывалі народнага мастацтва рэспублікі "Беларусь -- мая песня" ансамбль стаў лаўрэатам.

На здымку: ансамбль "Жалейка".

Фота Аляксандра Хітрова, БелТА.

Давайце спяваць па-беларуску



Ох доля

Песня з рэпертуару ансамбля "Свята", запісана В. Статкевічам у Калінкавіцкім р-не, на Гомельшчыне.

Сонейка заходзіць
У вокны пaглядае
Паўлюк на Ганулю
Скоса пазірае

Прыпеў:

Ох, доля мая, }
Сіні вочы твае. } 2 р.
Як цябе не бачу }
Баліць сэрца мае. }

Як тая цяцера,
Што ляцець ня хоча,
Гэтак маё сэрца
За табой ляскоча.

Прыпеў:

Як тыя калёсы,
Што рыпяць без мазі,
Я прыліп да цябе,
Як свіння да гразі.

Прыпеў:

Ой, высах, жа высах,
Як лапаць на печы,
А ты мне ўсё кажаш,
Што я не дарэчы,

Прыпеў:

Куплю табе цэбар,
Пастаўлю ля хаты,
Хай табе напомніць,
Што я не жанаты.

Першы куплет паўтараецца.

Жывая кніга прыроды

Для педагогаў дашкольных устаноў. Укладальнік Ірына Марачкіна

ЛЕТА. ЖНІВЕНЬ.

Жнівень – апошні месяц лета. Ягоная назва паходзіць ад слова "жніво", якое прыпадае на гэты час.

У народзе кажуць: жнівень сее, жне і косіць – на сталах багацця досыць.

Жнівень, звычайна, самы багаты месяц на грыбы: масլякі, баравікі, махавікі, апенькі.

На агародзе вырастае бульба, агуркі, памідоры, морква, буракі.

Паспяваюць раннія гатункі яблык, брусніцы і ажыны.

Жнівень халаднейшы за ліпень. Адчуваецца набліжэнне восені.

Птушкі збіраюцца ў вырай. Першымі, у сярэдзіне месяца, адлятаюць стрыжы, за імі – ластаўкі.



ЖНІВЕНЬ

Жнівень шчодры,
жнівень дбайны
І руплівы лета сын.
Ён прыспешвае камбайны:
-Праспеюць каласы!
Кажа сонейку лагодна:
-Нам гуляць цяпер не час.
І ў садах, і ў агародах
Не абыдуцца без нас.
Падрумянім садавіну
Яркай фарбай, нібы жар,
І падчэрнім дзеткам спіны,
Каб мацнейшы быў загар.
Агародніну даспелім,
Пачырвонім, паджаўцім,
Каб усе з ахвотай елі,
Каб была па густу ўсім.

Ніна Галіноўская.

ЖЫТА

Вецер шэпча з каласамі.
Жмураць вочы васількі.
Жыта колецца вусамі –
Асцяродна, матылькі!

Ніна Галіноўская.

ЦЫБУЛЯ

Сто адзежын
Апранула,
Твар
Ад сонца
Захінула,
Як старэнькая
Бабуля,
Дрэмле,
Седзячы,
Цыбуля.

Аўяр'ян Дзеружынскі.

ЖНІВЕНЬ

Бяда перапёлцы ў жніўні. У жніўні сярпы звіняць, камбайны гудуць, снапы покатам кладуцца... А беднай перапёлцы нідзе прытулку няма. Не паспела яна ў жыце гняздо звіць, птушанят падгадаваць, як Жнівень ужо гукае:

Час адгэтуль вылятаць –
Пачынаю жыта жаць.

Ледзь уцякла перапёлка з жыта. Дзяцей ад страху пагубляла... Доўга пасля клікала іх: "Спаць пара!" А калі сабрала, павяла хуценька ў пшаніцу.

- Тут зраблю гняздзечка, - кажа сваім дзеткам перапёлка.

Толькі паспела месца выбраць, як Жнівень зноў загукаў:

Пакідай сваю святліцу –
Пачынаю жаць пшаніцу!

Пырхнула перапёлка ў ячмень. Зноў дзяцей пагубляла. Доўга шукала і клікала: "Спаць пара! Спаць пара!" Знайшоўшы, павяла ў ячмень.

- Тут нас ніхто не патурбуе!

Але раптам над самаю яе галавою зазвінела каса...

- Вылятай, перапёлка! – пачуўся голас Жніўня.

Спалохалася перапёлка і наўцёкі... Зноў дзетак пагубляла. Доўга клікала: "Спаць пара! Спаць пара!" Дакліkалася і пайшла ў аўсы. Але не паспела і аснаваць гняздо, як пачула: "Вылятай, перапёлка!"

Перапалохалася бедная, сіганула ў проса, адтуль у грэчку. Нарэшце ў бульбу, а Жнівень – за ёю. "Вылятай, перапёлка! Вылятай!" – усюды чуецца яго голас.

Пырхнула перапёлка на агароды, а за ёю – дзетак чароды. Паляцела яна над лугам, а за ёю – птушаняты цугам.

Акрыялі, падужэлі яе дзеткі ад тых пералётаў. Пацямнелі ў іх крыльцы, паспрытнелі ножкі. Не агледзелася перапёлка, як дзеткі яе выраслі. А тут ужо канчаецца лета цёплае, пара ў вырай збірацца.

Сабрала перапёлка сваю вялікую сям'ю і паляцела зімаваць у вырай.

Клаўдзія Каліна.

У ДОЖДЖ

Зазвінелі, загулі
Пругкія струмені.
Затрымцелі на галлі
Лісці ў нецярпенні.
Сітнягі і чараты
Навастрылі пікі.
Чарацянкі,
Раты параскінуўшы, пінькаюць.
Папярхнуліся дажджом
Жоўтыя гарлачыкі.
Прыкрываюцца лістом.
Скачуць, быццам мячыкі.
Іх не згоніць скразняком,
Будуць вадалазамі,
Бо сцяблінаю-шнурком
Аж да дна прывязаны.

Рыгор Барадулін.


ЯЧМЕНЬ

Ячмень-вусач
Хаця калючы,
Але зусім,
Зусім не злючы...
На сонцы летнім
Зіхаціць,
Пад ветрам лёгкім
Шапаціць.
Даспее на палях
Ячмень,
Сажне камбайн яго
За дзень.

Аўяр'ян Дзеружынскі.

МАГАЗІН НА ГРАДКАХ

Прыйдзіце ў наш вясковы агарод –
Гарбуз імкнецца на высокі плот,
Сядзяць на градцы важна буракі,
Выглядваюць з-пад лісця агуркі.
Карункі-косы морква распляла,
Фасоль прыгожа гэтак зацвіла.
А бручка з рэдзькай
шэпчуцца ўвесь час:
"Цікава ведаць, хто ж
таўсцейшы з нас?"
Сцяной стаіць зялёна-сіні боб.



Прыемным пахам дыхае ўкроп.
Гарох вусаты сцелецца на дол.
Салату клікні – пабяжыць на стол.
Капуста дбайна росціць качаны:
"Хутчэй бы сталі цвёрдыя яны!"
Сябруюць і цыбуля, і часнок,
А шчаўе адышло ад іх убок.
Стаіць сланечнік, нібы вартавы,
Сур'ёзны, не паверне галавы.
У бантах яркіх палымнее мак.
Да сонца ў госці просіцца, дзівак.
А памідоры, нібы ліхтары,
Вісяць па аднаму, па два, па тры.
Клубніка ажно просіцца ў рот.
Багаты магазін – наш агарод!

Ніна Галіноўская.

КАЛАСОК

Я знайшоў на
ржышчы
Спелы каласок,
Гэта нівы летняй –
Сонечны сынок.
Сціплы і маўклівы,
Быў амаль відзён,
А на самай справе –
Скарб вялікі ён.
Бо ў ім ажно сорак
Казачных братоў.
Кожны з іх па столькі ж
Адшукаць гатоў,
Каб мы невыводна
Мелі на стале
Заўтра і заўсёды
Свежы, смачны хлеб.
Як завуць, скажыце,
Гэтакіх браткоў?
Не кідайце ў полі
Летам каласкоў.

Міхась Пазнякоў.

ПАСЛЯ ДАЖДЖУ

- Дзядзя,
колькі сонца на свеце?
Запыталі ў мяне дзеці.
Адказаў:
-Адно.
Смяюцца:
-Не адно, а іх – без ліку.
Сапраўды, пачаў лічыць я:
У кожнай лужы– сонца блікі.

Максім Танк.

АПЕНЬКІ

Па каранях, як па ступеньках,
Бясстрашныя – ці ноч, ці дзень,
Палезлі рабыя апенькі
На заімшэлы вольхі пень.

Кастусь Цвірка.

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік:
ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі:
№ 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі:
220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў:
231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 14. 08. 2000 г.
Наклад 2700 асобнікаў. Замова № 2196
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 147 руб., 3 мес.- 441 руб.
Кошт у розніцу: 40 руб.